Источник: "Беларусь" — № 12, 2013–12–25





# ПУШЧА не церпіць мітусні

**Нацыянальны парк “Белавежская пушча” застаецца ўнікальным месцам на планеце**



Валянціна Казловіч. Пушча не церпіць мітусні

Восень хоць і заставалася гаспадыняй "на птушыных правах", адчувала сябе ў Нацыянальным парку "Белавежская пушча" цалкам упэўнена нават у пачатку снежня. Мінусавая тэмпература ў рэліктавы лес прыйшла без снегу. Шэрае неба накрывала вершаліны грабаў, лёгкім туманам пранікаючы да асновы стваloў і завостраных грабавых лісточкаў, якія ўслалі зямлю. Цішыня…

— Наўрад ці ўдасца сфатаграфаваць жывёл на волі, — расчаравала экскурсавод. — Яны пакуль не прыходзяць карміцца…

Высветлілася, будучы прыход сапраўднай зімы — снежнай, з завеямі — у нацыянальным парку вызначаюць не па календары, а па… зубрах. Збіраюцца волаты на пляцоўках для падкорму — чакай халадоў. Не з'яўляюцца на вочы людзям — зіма яшчэ далёка, нягледзячы на "прапісаных" у пушчы Дзеда Мароза і Снягурку.

## Дарожная карта для зубра

Няма сумнення, што жывёла, якая асацыіруецца ў замежнікаў з Беларуссю, гэта — зубр. Сёння дзякуючы намаганням многіх людзей у пушчы створаны другі ў свеце па колькасці статак зуброў. Радавацца трэба? Не, лічба не дае падставы. Хутчэй трывожыць. Зуброў намнога больш, чым пушча можа пракарміць. Дабаўце іншых капытных, і атрымаеце ўяўленне аб тым прэсінгу, якому падвяргаецца экасістэма самага старога лесу Еўропы. На падкорм жывёл штогод траціцца немалыя грошы — з бюджэту, а таксама заробленыя нацыянальным паркам на турызме і дрэваапрацоўцы. Цяпер навукоўцы ламаюць галаву: што рабіць з "чырванакніжнікам", якога стала так многа?

Жывёлы даўно перайшлі тую мяжу, за якой гаспадарамі ім быць не прынята. Яны ніколі не баяцца, знішчаючы цэлыя палі сельгаспрадпрыемстваў.

Прад'явіць прэтэнзіі пушчы праз суд гаспадаркі не могуць, таму што зубр — у Чырвонай кнізе.

Зубры даволі пераборлівыя ў ежы. Рацыён у іх спецыфічны. І ў халодны час волатам не хапае ежы. Дапамагае чалавек. У пушчы да зімы нарыхтавалі па тысячы тон сена і сіласу, буракі, соль. Турысты, якія гуляюць ля вальераў, таксама могуць паўдзельнічаць у добрай справе: на падыходзе можна купіць агародніну і пачаставаць зубра або касалапага мішку. Раней турысты куплялі хлеб у магазіне, а хлеб — не самая лепшая ежа для дзікіх жывёл.

**Надыход сапраўднай зімы — снежнай, з завеямі — у нацыянальным парку вызначаюць не па календары, а па… зубрах. Збіраюцца волаты на пляцоўках для падкорму — чакай халадоў**

Цёплы лістапад не прыгнаў дзікіх звяроў на падкормачныя пляцоўкі. Хапала ежы ў лесе. А вось снежань зуброў прыцісне — прыйдуць бліжэй да людзей.

Намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага парку "Белавежская пушча" па навукова-даследчай рабоце Васіль Арнольбік расказаў, што з кожным годам на зуброў траціцца вялікія грошы:

— У рэгулюемых і гаспадарчых зонах палі засявалі люцэрнай, рапсам, ячменем, аўсом і карняплодамі. Пабудавалі новыя адрыны-кармушкі.

Сучасны зубр без чалавека не пражыве, лічыць старшы навуковы супрацоўнік нацыянальнага парку Аляксей Буневіч. Дакладней, без дапамогі ў кармленні, забеспячэнні вітамінамі і нават у барацьбе з хваробамі. Бо ўсе беларускія зубры — нашчадкі ўсяго толькі сямі асобін, і блізкароднаснае скрыжаванне прыводзіць да страты генафонду.

Аптымальная колькасць для нацыянальнага парку — 300-350 асобін. Гэта значыць, на сотню-паўтары менш, чым цяпер.

## Што рабіць з "лішнімі" зубрамі?

Задачу вырашаць у тым ліку і аддзелу зубразнаўства, які нядаўна створаны ў нацыянальным парку.

Ужо рэалізуецца першы этап нацыянальнага "Плана мерапрыемстваў па захаванні і рацыянальным выкарыстанні зуброў у Беларусі". Жывёлы асвоілі новыя месцы пасялення: Налібоцкую



стар. 38



Валянціна Казловіч. Пушча не церпіць мітусні

стар. 37 пушчу, Прыпяцкі нацыянальны парк, Асіповіцкі, Барысаўскі, Гродзенскі лясгасы. Дзесяць зуброў сёлета набыла адна з фермерскіх гаспадарак Віцебскай вобласці.

Сёння ўжо вялікая частка з 1.156 беларускіх зуброў жыве па-за пушчай. І хоць былі выпадкі продажу жывёл у Яраслаўль, Карэлію, Арлоўскую вобласць Расіі, перасяляць пушчанскіх волатаў за межы краіны пакуль праб259матычна.

Магчыма, дапаможа вырашыць сітуацыю праект Саюзнай дзяржавы, курыраваць які ад Беларусі будзе Навукова-практычны цэнтр па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук. Ад Расіі — Інстытут праблем экалогіі і эвалюцыі жывёл імя А. М. Северцава Расійскай акадэміі навук.

У кастрычніку ў пушчы збіраліся навукоўцы Беларусі, Расіі і Польшчы. Будучыня зубра была ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў міжнароднага ўстановачнага семінара праграмы Саюзнай дзяржавы "Фарміраванне аптымальнага арэала еўрапейскага зубра як гарантыі яго даўгачаснага захавання" ("Дарожная карта для зубра").

Рэзюмэ: калі не падысці да праблемы сур'ёзна, то гадоў праз сто-дзвесце еўрапейскіх зуброў у Беларусі і Расіі... можа не застацца. Пры тым, што пушча перанаселена? Менавіта так.

Мерапрыемствы праграмы будуць праводзіцца ў 2014-2018 гады.

Васіль Арнольбік ускладае вялікія надзеі на сумесную работу:

— Мы плануем больш глыбока вывучаць зубра як від. З генетыка-селекцыйнай ацэнкай. Маюць намер стварыць у нацыянальным парку рэспубліканскі цэнтр па захаванні і вывучэнні зубра. Каб можна было праводзіць даследаванні, адбіраць лепшых асобін, рэкамендаваць іх для папаўнення іншых папуляцый, у тым ліку ў Расіі. А таксама для груповак унутры пушчаў, таму што не ўсе яны паміж сабою кантактуюць.







У рэзідэнцыі Дзеда Мароза шмат забаваў

## Падзея сусветнага значэння

Галоўнай падзеяй 2013-га ў нацыянальным парку называюць прадаўжэнне Дыплома Савета Еўропы.

У канцы сакавіка Камітэт міністраў Савета Еўропы прыняў рашэнне падоўжыць на пяць гадоў Еўрапейскі Дыплом асабліва ахоўных прыродных тэрыторый для Нацыянальнага парку "Белавежская пушча".

Гэтага чакалі цэлых шэсць гадоў! Упершыню пушча атрымала Дыплом у 1997 годзе, стаўшы самым тытулаваным прыродным аб'ектам цэлага еўрапейскага кантынента (у 1992-м годзе ЮНЕСКА ўключыла частку пушчы ў спіс Сусветнай спадчыны чалавецтва, у 1993-м годзе парк атрымаў статус біясфернага запаведніка).

Тэрмін дзеяння дыплома быў прыпынены ў 2007 годзе — да выканання адміністрацыяй нацыянальнага парку рэкамендацый Савета Еўропы, накіраваных на захаванне біялагічнай разнастайнасці.

З прыходам новага генеральнага дырэктара Аляксандра Бурага ў парку многае змянілася і працягвае змяняцца ў лепшы бок. З кожным прыездам адчуваю гэта як турыст.

Прыродаахоўныя мерапрыемствы больш відаць спецыялістам. Галоўнае — амаль удвая павялічана плошча запаведнай зоны: з 30,7 тысячы да 57 тысяч гектараў.

Гэта азначае, што больш за 70 працэнтаў тэрыторыі Белавежскай пушчы — запаведныя. Сюды ўвайшла больш шасць участкаў рэліктавага лесу з унікальнай біялагічнай разнастайнасцю, за выключэннем тых, якія знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці да населеных пунктаў.



Валянціна Казловіч. Пушча не церпіць мітусні







Унікальны дуб



150-годдзе самай высокай жывой навагодняй ёлкі Еўропы адсвяткавалі ў Белавежскай пушчы

Дарэчы, наяўнасць Дыплома Савета Еўропы ніякіх фінансавых прэферэнцый не дае. Гэта прэстыж, прызнанне заслуг у ахове прыроды — і не толькі нацыянальнага парку, але краіны ў цэлым.

## З днём нараджэння, казка

Яшчэ адна важная падзея адыходзячага года — 10-годдзе пушчанскай сядзібы Дзеда Мароза.

Сюды цяпер едуць не толькі выконваць дзіцячыя жаданні. З цяперашняга года ў сядзібу завуць адзначаць дні нараджэння і нават рэгістраваць шлюбы. Першы шлюбны саюз Дзед Мароз, маёнтак якога на час ператварылі ў ЗАГС, змацаваў у верасні.

У студзені ў сядзібе чакаюць мільённага госця, а ў гэтыя дні Дзед Мароз і Снягурка сустракаюць шматлікія дзіцячыя дэлегацыі.

Да ўрачыстасцяў з нагоды 10-годдзя, якія выпалі на сярэдзіну снежня, былі абноўленыя і пабудаваныя розныя аб'екты. Новы ўбор — на навагодняй ёлцы, ярчэй свецяцца казачныя церамы, больш ілюмінацыі. У дапамогу Дзеду Марозу і Снягурцы ў маёнтак засялілі Бабу Карготу. Адкрыліся майстэрня Матухны Зімы і Музей ледзянога побыту. Устаноўлена казачная вярста, казачны дарожны знак, закладзена Алея казачнай славы.

Да юбілею сядзібы прымеркавалі і 150-годдзе Навагодняй Ёлкі, якая тут расце.

Васіль Арнольбік не хавае, што ўжо баяліся страціць дрэва:

— Ёлка стала засыхаць. Прынялі ўсе меры дапамогі — з'явіліся новыя зялёныя галінкі.

Падчас юбілейных урачыстасцяў кожны госць змог палюбавацца 43-метровай прыгажуняй.

І, зразумела, загадаць жаданне. Самі работнікі нацыянальнага парку прызналіся мне: "Спраўджваюцца!"

## Балоты — на месца!

Новы год прынясе ў пушчу новыя задачы. У нацыянальным парку плануюць паўторна забалоціць некалькі раней асушаных тэрыторый. Гаворка ідзе аб балотах Дзікі Нікор і Зубрыца.

Гідралагічны рэжым плануецца абнавіць і на малых і часовых вадацёках у гістарычнай частцы пушчы. Выканаўцам навукова-даследчай работы выступіў нацпарк. У памочніках — грамадскае аб'яднанне "Ахова птушак Бацькаўшчыны" ("АПБ").

З гэтага года і на працягу двух бліжэйшых гадоў на ўсёй тэрыторыі нацыянальнага парку праводзяцца лесаўпарадкавальныя работы. Ужо завершана аэра- і касмічная здымка тэрыторыі, а ў 2014 годзе пачнуцца палявыя работы па таксацыі дрэвастояў — улік лесу.

Новы лесаўпарадкавальны праект вызначыць развіццё пушчанскай лясной гаспадаркі на перыяд з 2016 па 2025 год.

У разгары цікавы міжнародны праект. Восенню адкрылася беларуска-польска-германская летняя школа для студэнтаў. Сёлета навучанне праходзіла на базе Белавежскага нацыянальнага парку (Рэспубліка Польшча), куды прыязджалі студэнты лясных спецыяльнасцяў ВНУ Эберсвальда, Беластока і Мінска. У наступным годзе студэнтаў прыме наш нацыянальны парк.

Словам, планаў — безліч. Маленькіх і вялікіх, але вельмі значных для запаведнага краю. І кожнага з нас.

...Калі ў мяне пытаюць пасля паездкі ў пушчу "ну як?", коротка адказаць цяжка. Белавежская пушча — асаблівае месца на планеце. Гэта не толькі бясцэнны куток дзікай прыроды. Пушча — месца асаблівай духоўнай сілы. І магчымасць у тым пераканацца мы маем у любы час года.

Валянціна **Казловіч**